# КАРПАТЛІВА ЗБІРАЦЬ, АШЧАДНА ЗАХОЎВАЦЬ

*М.М. Шкут*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

На аснове вывучэння і аналізу твораў студэнаў-выпускнікоў мастацка-графічнага факультэта установы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава", патомных народных майстроў Рэспублікі Беларусь створаныя цікавыя творы ў апошні час.

Ставіцца мэта разгледзець пытанні ўплыву народнага мастацтва традыцыйнага на сучасную творчасць мастакоў-студэнтаў, высветліць на прыкладах сучаснай практыкі нашы адносіны да мастацкай спадчыны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Пастановы аб мерах па паляпшэнні работы многіх відаў старадаўніх рамёстваў і мастацкіх промыслаў, прынятыя ўрадам Рэспублікі Беларусь, ўсвой час садзейнічалі і дапамагаюць развіццю дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Захаванне народных традыцый у сучасных мастацкіх промыслах – адна з актуальных праблем развіцця народнага мастацтва.

У сярэдзіне 70-х гадоў XX стагоддзя на мастацка-графічным факультэце А.Х. Кавалёў (выпускнік Ленінградскага вышэйшага мастацкага вучылішча імя В.І. Мухінай) арганізоўвае кафедру дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Прафесійнае дэкаратыўна-прыкладнае мастацтва, якое патрабавала падрыхтаваных кадраў і належнай базы не адразу змагло заняць прыкметнае месца ў вышэйшай установе. Яшчэ доўгі час адчувалася вострая патрэба ў кадрах прафесійных мастакоў вышэйшай кваліфікацыі, што ў значнай ступені паўплывала на развіццё дэкаратыўнага мастацтва ў рэспубліцы.

Першым выкладчыкам кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, акрамя загадчыка кафедры А.Х. Кавалёва стаў выпускнік МГФ І.П. Хіцько, які пачаў выкладаць разьбу па дрэве.

У мастацкай апрацоўцы дрэва, як і ў іншых сумежных галін дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, адбываецца складаны працэс якасна новага пераасэнсавання спадчыны. Разьба па дрэве на МГФ з года ў год узбагачаецца новымі жанрамі, стылістычнымі і тэхналагічнымі знаходкамі, самабытнымі таленавітымі творамі студэнтаў. Выкладае разьбу на мастацка-гафічным факультэце выпускнік гэтага факультэта, цяпер дацэнт кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і тэхнічнай графікі Іван Паўлавіч Хіцько. Гэта сур'ёзны мастак-даследчык, які на працягу многіх гадоў падарожнічаў амаль што па ўсіх раёнах Беларусі. Ён грунтоўна вывучыў і сабраў шматлікі каштоўны як у навуковым, так і практычным плане матэрыял аб беларускай народнай разьбе па дрэве, так і па архітэктурным дэкоры, выкананы народнымі і прафесійнымі разьбярамі.

"Патрыярх выкладання беларускай разьбы па дрэве, зайздросны даследчык", – так называюць калегі Івана Паўлавіча Хіцько. Амаль за пяць дзесяцігоддзяў (47 гадоў) выкладання на МГФ выйшла ў свет шмат яго артыкулаў па даследаванні разьбы па дрэве, у тым ліку грунтоўны дапаможнік "Мастацтва разьбы па дрэве" (1998), "Технология народных ремесел" (2007) для вучняў агульна-адукацыйнай школы і іншыя навукова-метадычныя дапаможнікі. І.П. Хіцько таксама актыўны ўдзельнік абласных, рэспубліканскіх і міжнародных выставаў, як майстар-мастак разьбы па дрэве.

Здабыткам паспяховага навучання і развіцця рэгіянальных традыцый разьбы па дрэве з'яўляецца дыпломная работа мінулых гадоў групы студэнтаў: У. Пахаўцова, В. Багудзевіча, С. Баркунова і Ф. Клімянкова (кіраўнік І.П. Хіцько).

Багаццем дэкору і высокім майстэрствам вызначаюцца дыпломныя работы разьбы па дрэве выпускнікоў МГФ канца XX–пачатку XXI стагоддзя, дзе кіраўнікам з'яўляецца нязменны І.П. Хіцько. Шматлікія рамы для люстраў, абрамленні насценных гадзіннікаў, выкананыя рэльефнай разьбой, розныя сталы – шахматны пісьмовы – нагадваюць шматгранныя стылі: барока, готыку, ракако і мадэрну, выканаўцы: А.В. Нікіцін, В.В. Юркевіч, С.М. Гаркуноў, В.І. Сырэвіч, В.Д. Грушко, М.Ю. Сівакоў, Д.Ул. Будзіч і іншыя. Вельмі цяжка пералічыць усіх таленавітых дыпломнікаў дацэнта І.П. Хіцько, якія выконвалі свае творы ў розных тэхніках разьбы па дрэве.



Репозиторий ВГУ

Цікавай і змястоўнай з'явай на МГФ пры навучанні па спецыяльнасці "Керамісты" ў праграму ўключаны прадмет "Народныя мастацкія промыслы", лекцыі і семінары па народных старадаўніх рамёствах і промыслах Рэспублікі Беларусь. Як сведчыць фактыўны матэрыял, выток і развіцця народных мастацкіх рамёстваў і промыслаў нашай рэспубліцы бяруць пачатак з глыбокай старажытнасці. Сучасным народным мастацкім промыслам патрэбны мастакі-спецыялісты ў розных відах дэкаратыўна-прыкладнага мастацтва, якія былі б здольныя ствараць узоры для тыражыравання і грунтоўна навучаць у мастацкіх установах.

Зазначым, што ў сучасны час немагчыма адрадзіць народнае мастацтва ў тым выглядзе, у якім яно існавала ў мінулым. Галоўнае – не страціць нацыянальных традыцый народнага мастацтва. Патрэбна вярнуцца да прынцыпу народнага мастацтва – творы падобныя, але не аднолькавыя. Прафесіяналізм у студэнтаў МГФ павінен не набывацца аднекуль, а вырастаць на старадаўніх асновах народнага мастацтва. Важна пазбегнуць усяго наноснага, чужога прынцыпам народнага мастацтва, інакш нам пагражае страта гэтых прынцыпаў, замена іх прафесійнай стылізацыяй пад народнае мастацтва.

Выставачная зала МГФ, у якой захоўваюцца вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва мінулых выпускнікоў, – не толькі навукова-метадычны цэнтр, яе можна назваць і музейным фондам. Гэта натуральны працэс цікавасці да гісторыі прыкладнога мастацтва факультэта, да традыцый, якія дапамагаюць асэнсаваць з'явы сённяшняга дня, навукова-метадычную і выхаваўчую работу. Музейныя экспазіцыі даюць магчымасць непасрэднага кантакту з першакрыніцамі прыкладнога мастацтва на факультэце, уцягваюць у сферу экскурсійнай прапаганды і па-сапраўднаму працуюць на фарміраванне эстэтычнага выхавання. Такім чынам, выставачная зала-музей МГФ знаходзіцца на якасна новым і адказным этапе свайго развіцця. Яркія і самабытныя вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўражваюць гледача шматлікай жанравай разнастайнасцю, багаццем формаў, незвычайным узлётам творчай фантазіі студэнтаў і выкладчыкаў. Вырабы захоўваюць традыцыі народнага мастацтва, развіваюць іх, даюць ім новае жыццё.

Значнае месца належыць разьбе па дрэве. Гэтыя вырабы цікавыя, маюць яскрава індывідуальнае аблічча, працягваюць традыцыі. Студэнты пры выкананні разьбы па дрэве, вырабаў з гліны, саломкі, лазы надаюць новыя рысы мастацкаму абліччу. За шматлікія дзесяцігоддзі на факультэце скламіся адпаведныя кампазіцыйныя структуры гэтых выставачных работ, якія даюць сучасным студэнтам багаты матэрыял для творчых пошукаў. Яны вабяць гледача сваімі непаўторнымі рысамі.

Дасканальныя даследаванні народнага мастацтва па вёсках усіх раёнаў Беларусі адкрываюць невядомыя дагэтуль шматлікія тыпы аздаблення беларускай разьбы па дрэве, вырабаў з гліны, ільну, лазы, саломкі і іншых матэрыялаў. Трэба спадзявацца, што выкладчыкі, студэнты МГФ, абапіраючыся на традыцыі, яшчэ парадуюць гледача ў выставачнай зале непаўторнымі, характэрнымі для народнага мастацтва нашай рэспублікі шматлікімі творамі.

Ні адзін дзесятак краін свету сёння набываюць самабытныя вырабы, сувеніры Жлобінскай фабрыкі мастацкай інкрустацыі, Брэсцкай фабрыкі сувеніраў. Адметнасць гэтых вырабаў у тым, што майстры не адыходзяць ад народных матываў, фарбаў, каларыту ў сваім мастацтве. Па іх вырабах можна меркаваць аб мастацкіх асаблівасцях, аб звычках і традыцыях беларускага народа.

Старадаўнія рамёствы і промыслы з'яўляюцца неад'емнай часткай айчыннай культуры, актыўна ўплываюць на фарміраванне мастацкіх густаў, узбагачаюць прафесійнае мастацтва студэнтаў.

**Заключэнне.** Выставачная мастацкая зала-музей МГФ павінна жыць, расшырацца па сваім памеры, захоўваць свае багатыя народныя традыцыі, рыхтаваць маладых майстроў-педагогаў, дарыць гледачу радасць судакранання з рукатворнымі вырабамі студэнтаў і несці ў заўтрашні дзень прыгажосць. На нашу думку, патрэбна ўлічыць у будучым па накапленні дыпломных работ па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве ісці шляхам строгага гістарызму ў развіцці той ці іншай галіны, віду народнага мастацтва ці матэрыяльнай культуры.



Рэпазіторый ВДУ

Абавязкова прасачыць мясцовыя асаблівасці ў бытавым укладзе і народным мастацтве. Экспазіцыю дыпломных прац, выкананых у традыцыях народнага мастацтва, будаваць па асноўных і падсобных відах традыцыйнай гаспадаркі, промыслах і рамёствах беларусаў. Спецыялізацыя ў выставачнай зале МГФ – актуальная справа сучасных навук, у тым ліку і такіх, як этнаграфія і мастацтвазнаўства. Неабходна імкнуцца, каб кожная выстаўка дыпломных прац у раздзелах была закончанай, унутрана цэласнай.

Шмат дае выстаўка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ні толькі студэнтам, вучням школ, а і мастакам-прафесіяналам, якія працуюць у сістэме мастацкай прамысловасці. Засяродзіўшы ўвагу на вырабах чыста сувенірнага прызначэння, яны зачастую забываюцца пра вытворчасць тавараў шырокага ўжывання, якія б стваралiся на аснове нацыянальных традыцый, рацыянальнага сінтэзу функцыі і формы, утылітарнага і эстэтычнага.

Падоўгу затрымліваюцца наведвальнікі, асабліва вучні пачатковых класаў у царстве саломкі, разьбе па дрэве і габелена. Са шкадаваннем пакідаюць выстаўку, абяцаючы зноў прыйсці на спатканне з гэтым дзівам. І доўга яшчэ будзе жыць у памяці тых, хто наведваў выставачную залу мастацка-графічнага факультэта, так званы навукова-метадычны цэнтр, створаны рукамі нашых выпускнікоў-дыпломнікаў пад кіраўніцтвам выкладчыкаў факультэта.

Адкрыццё на мастацка-графічным факультэце музея дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і выставачнай залы – прыемная з'ява, якая сведчыць аб імкненні студэнцкай моладзі не парываць сувязі з нацыянальнымі традыцыямі беларускага народа, шанаванні і ўзбагачэнні яго культурнай спадчыны.

Дыпломныя работы студэнтаў МГФ па дэкаратыўна-прыкладным мастацтву становяцца арэнай наватарскіх пошукаў, працягу і ўзбагачэння народных традыцый у галіне пластычных мастацтваў. Расце цікавасць студэнтаў-выпускнікоў да выяўленчай метафары і мовы выяўленчага мастацтва. Паглыбляюцца сувязі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з іншымі відамі творчасці, назіраецца імкненне да сінтэзу бытавога, прадметнага асяроддзя з сучасным інтэр'ерам.

Зазначым, што прааналізаваны матэрыял сведчыць аб тым, што ў творчым жыцці МГФ ў выставачнай зале, акрамя існуючага музея дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, сістэматычна дэманструюцца не толькі творы мастацтва сваіх студэнтаў, выкладчыкаў, але і ўсіх мастакоў Рэспублікі Беларусь. Інтэнсіўнае развіццё дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў наш час сведчыць аб тым, што ў Віцебскай, як і ў іншых мастацкіх школах, адбываецца няспынны працэс далейшага ўдасканалення нацыянальных мастацкіх традыцый, іх крышталізацыі. Творам Віцебскай мастацкай школы ўласцівы глыбокі ідэйны змест, філасофскі роздум над жыццём, цесная сувязь з народнай культурай.

Даволі шырокая шматпрофільнасць дыпломных работ на мастацка-графічным факультэце: багацце новых думак, шматграннасць пошукаў, хаця і не заўсёды бясспрэчных, стварае моцны творчы напал.

Наватарскія напрамкі ўласцівы і сённяшнім студэнтам мастацка-графічнага факультэта, якія прысвячаюць свой талент мастацкаму асэнсоўванню сучаснасці, раскрыццю духоўнага аблічча.

А грунтоўны прафесіянальны аналіз іх работ вопытнымі педагогамі дае новы творчы імпульс будучым майстрам пэндзля і разца. Далучэнне творчай моладзі да жыватворных рэалістычных традыцый, стымуляванне ў маладых майстроў жыццёвай неабходнасці размаўляць мовай выяўленчага мастацтва аб галоўных з'явах у нашым жыцці, аб патрыятычных справах сваіх сучаснікаў – прадмет пастаянных клопатаў іх настаўнікаў.

Варта адзначыць усе, што экспануецца ў музеі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, гаворыць пра вялікі талент педагогаў і студэнтаў, пра іх невычэрпную фантазію і багатую вобразнасць, пра майстэрства кампазіцыйных рашэнняў.

Агульныя праблемы развіцця народнага мастацтва ў Рэспубліцы Беларусь – задача не толькі мастацка-графічнага факультэта, Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Рэспублікі Беларусь, Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь і іншых ведамстваў і арганізацый, а справа агульнанародная, дзяржаўная.



Рэпазіторый ВГУ